Афіцыйная беларуская дэлегацыя ў шосты раз прымае ўдзел у рабоце сярэднярускага эканамічнага форуму (г. Курск)

Сёння, 16 чэрвеня, у Курску (Расійская Федэрацыя) праходзіць VI сярэднярускі эканамічны форум. У гэтым годзе Форум прысвечаны тэме: СУЧАСНАЯ ЭКАНОМІКА Ў ЛІЧБАВАЙ ПРАСТОРЫ.

У форуме прымае ўдзел беларуская дэлегацыя, якая складаецца з кіраўніка аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у г. Смаленску Шульгі Ч.К., памочніка Міністра сувязі і інфарматызацыі Аляшкевіч Н.А., намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Некрашэвіча В.У., члена Прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, старшыні пастаяннай камісіі па эканоміцы і ЖКГ Маціевіча В.А ., памочніка намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Падрабінкінай Ю.А., в.а. дырэктара Жлобінскага філіяла УП «Гомельскае аддзяленне БелГПП» Ганжуровай І.Л. і інш.

Арганізатарам СЭФ-2017 перададзена прывітальнае слова ад Кіраўніка беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю, Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Папкова Сяргея Пятровіча.
«За невялікі перыяд Форум набыў шырокую міжнародную вядомасць, зарэкамендаваў сябе як карысны дыскусійны фармат, стаў маштабнай пляцоўкай для абмену вопытам і абмеркавання самых актуальных праблем, а таксама выпрацоўкі новых падыходаў да іх вырашэння. Прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь кожны год прымаюць удзел у дадзеным форуме», - гаворыцца ў прывітанні.

Сяргей Папкоў адзначыў актуальнасць тэмы шостага сярэднярускага эканамічнага форуму - Сучасная эканоміка ў лічбавым прасторы, звярнуўшы ўвагу на тое, што лічбавая трансфармацыя з'яўляецца асноўным інструментам павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, якасці жыцця насельніцтва і эфектыўнасці сістэмы дзяржаўнага кіравання.

Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь павіншаваў арганізатараў Форуму з адкрыццём шостага сезону і пажадаў удзельнікам паспяховай працы, устанаўлення новых дзелавых і асабістых кантактаў, дасягнення пастаўленых мэтаў, далейшага плённага супрацоўніцтва.

Форум пачаў сваю работу з адкрыцця выставы, дзе прадстаўлена высокаканкурэнтная прадукцыя, выпушчаная вядучымі прадпрыемствамі і арганізацыямі Курскай вобласці і іншых расійскіх рэгіёнаў, у тым ліку комплекс «Бяспечны горад», касмічныя праграмы, якія рэалізуюцца ў ВНУ, і іншыя перадавыя напрацоўкі ва ўсіх галінах эканомікі і сацыяльнай сферы. Па традыцыі свае інавацыйныя праекты і ідэі прэзентуюць маладыя навукоўцы, студэнты навучальных устаноў і ВНУ.

Афіцыйнае адкрыццё Форуму адбылося на пленарным пасяджэнні, на якім абмяркоўваюцца пытанні цыфравізацыі эканомікі Цэнтра Расіі, уцягнутасці рэгіёнаў у фарміраванне інфармацыйнага грамадства, кірункі нацыянальнай палітыкі па развіцці лічбавай эканомікі,

роля ў ёй дзяржавы і многія іншыя пытанні. Абмеркаванне тэмы працягнецца ў другой палове дня ў часе тэматычных модуляў, якія закранаюць самыя актуальныя, на думку арганізатараў, пытанні.

У гэтым годзе тэматычных модуляў будзе шэсць: «Цыфравізацыя ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Электронная інфраструктура», «Новая архітэктура малога і сярэдняга прадпрымальніцтва», «Укараненне інфармацыйных тэхналогій у прамысловасці і аграпрамысловым комплексе. «Дакладнае земляробства» у сельскай гаспадарцы Чарназем'я. Электронны гандаль для рэальнага сектара», «Лічбавыя тэхналогіі ў фінансавай і банкаўскай сферы. Безнаяўны свет», «Роля моладзі ў лічбавай эканоміцы. Змаганне праектаў маладых навукоўцаў і прадпрымальнікаў», «Сацыяльныя праекты ў лічбавай прасторы: магчымасці і рызыкі».

Вядучы пленарнай дыскусіі, як і ў мінулым годзе, - вядомы публіцыст і тэлевядучы Аляксандр Архангельскі.

Падрабязнасці на сайце СЭФ-2017

Даведачна: З 2009 года за Міністрам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь замацавана Курская вобласць Расійскай Федэрацыі і ўскладзена персанальная адказнасць за прасоўванне нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у гэтым рэгіёне Расіі і актывізацыю двухбаковых адносін. Міністр сувязі і інфарматызацыі з'яўляецца кіраўніком беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю.

Source URL: *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/16-06-2017-2062*